УДК 908(476)

# СПЕЦЫФІКА ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ ТРАДЫЦЫІ ПАЛЕШУКОЎ

***І. Я. Сільчанка***
*курсант 2 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь*
*Навуковы кіраўнік:* ***А. М. Шубадзёрава****,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Унікальнасць Палесся як цэласнага этнакультурнага рэгіёна вызначаецца у першую чаргу тым, што гэта адзін з найбольш старажытных арэалаў рассялення славян і фарміравання іх культуры. Нягледзячы на тое, што Палессе мае даволі працяглую тэрыторыю і ўваходзіць у склад чатырох краін, яно мае адзіную традыцыю.

Адзіная палеская традыцыя характарызуецца ўласцівым для гэтага рэгіёна корпусам фальклорных тэкстаў, падобных міфалагічных матываў і сюжэтаў, абрадавых элементаў, адметным побытам і мовай. Спалучэнне усіх гэтых асаблівасцей вылучае палескую традыцыю сярод іншых славянскіх. Як адзначаюць навукоўцы, яна да самага апошняга часу цудоўна захоўвала ў сабе шматлікія архаічныя элементы славянскай культуры, поўнасцю ці часткова страчаныя ў іншых рэгіёнах [1].

Комплекснае этналінгвістычнае вывучэнне мовы і традыцыйнай духоўнай культуры Палесся доўжылася не адзін дзесятак гадоў. Яно было распачата толькі ў сярэдзіне XX стагоддзя пасля таго, як Інстытутам славяназнаўства было арганізавана шэраг экспедыцый на Палессе ў першую чаргу для збору матэрыялаў дыялектнага слоўніка, а пазней — для вывучэння мовы, фальклору, традыцыйнай культуры палешукоў.

Вялікае значэнне для раскрыцця сутнасці адзінай палескай традыцыі мела электронная апрацоўка багатага Палескага архіва, сабранага экспедыцыямі 1970–1980 гг. Матэрыялы архіва шырока выкарыстоўваліся пры напісанні навуковых работ, прысвечаных культурна-гістарычнай спадчыне палешукоў. З апошні час палескія даследаванні ўзбагаціліся вялікай колькасцю прац і пераўтварыліся ў асобую галіну славістыкі.

Адзінства палескай традыцыі зусім не мае на ўвазе яе аднароднасць і нязменнасць ні ў лінгвістычным, ні этнаграфічным, ні ў фальклорным плане. Наадварот, тэрыторыя Палесся вельмі цікавая і разнастайная і дазваляе выявіць не толькі падабенства, але і шматлікія адрозненні, якія характэрны для розных частак данага рэгіёна.

Вынікі мінулых і будучых даследаванняў культурна-гістарычнай спадчыны Палесся паслужаць каштоўным матэрыялам для рашэння праблем славянскага этнагенезу.

---

1. Народная демонология Полесья : публикации текстов в записях 80–90-х годов XX века : в 4 т. / Сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская ; Ин-т славяноведения РАН, Рос. гос. гуманитар. ун-т. М. : Языки славянских культур, 2010. Т. 1 : Люди со сверхъестественными свойствами. 648 с. Вернуться к статье